

**Эмануіл ЮФЕ**

*Доктар гістарычных навук, прафесар.*

*Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Беларусі, ваенная гісторыя XX стагоддзя, гісторыя навукі і культуры Беларусі, гісторыя спецслужб, біяграфіі сусветна вядомых беларусаў, гісторыя яўрэяў Беларусі.*

*Аўтар больш за 1035 навуковых прац, у тым ліку 51 кнігі і брашуры.*

# МІКАЛАЙ ГІКАЛА — палітычны і дзяржаўны дзеяч перыяду пабудовы сацыялізму

**Мікалай Фёдаравіч Гікала ў 1932—1937 гг. з'яўляўся першым сакратаром ЦК КП(б)Б. На гэтай пасадзе ён праводзіў актыўную палітыку індустрыялізацыі, калектывізацыі, развіцця культуры. Стаў адным са стваральнікаў культу асобы Сталіна ў БССР. Быў у ліку тых, хто праводзіў палітычныя рэпрэсіі, ахвярай якіх зрабіўся потым і сам.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Мікалай Гікала нарадзіўся 20 сакавіка 1897 г. у Адэсе ў сям'і фельдфебеля Фёдара Гікалы. У 1901 г. сям'я пераехала ў Грозны. У 1915 г. 18-гадовы юнак завяршыў трохгадовы курс навучання ў Тыфліскай ваенна-фельчарскай школе і быў мабілізаваны на Каўказскі фронт Першай сусветнай вайны.

Расійскі гісторык В.М.Марозава канстатуе: "*По одной версии, он добровольно пошёл в действующую армию, воевал на Кавказском фронте, был награждён Георгиевским крестом, по другой — служил ветеринаром при госпитале, и его обязанностью было наблюдение за санитарным состоянием мяса, поступающего для больных и раненых*" [2, с. 38].

У ліпені 1917 г. М.Гікала ўступіў у РСДРП(б). У гады Грамадзянскай вайны ён зрабіў ваенную кар'еру. На працягу 1918—1919 гг. разам з партыйнымі дзеячамі ўсталёўваў савецкую ўладу ў Грозным, узначальваў партызанскі атрад з гарадской беднаты і чырвоных казакаў. У 1920 г. па рашэнні Каўказскага краявога камітэта РКП(б) і Рэўваенсавета 11-й арміі ўсе партызанскія атрады былі аб'яднаныя ў Церскую групу чырвоных паўстанцкіх войск на чале з 23-гадовым М.Гікалам. 25 сакавіка 1920 г. старшыня Паўночна-Каўказскага рэўкама, старшыня Бюро па аднаўленні савецкай улады на Паўночным Каўказе С.Арджанікідзэ тэлеграфаваў Уладзіміру Леніну: "*Вчера нашими войсками занят город Грозный… Командующему повстанческими войсками Гикало вручён орден Красного Знамени*" [3, с. 230].

У 1920 г. яго прызначаюць ваенным камісарам Церскай вобласці, пасля камандуючым Персідскай Чырвонай арміяй. Восенню 1921 г. ён вярнуўся на Каўказ.

Партыйная кар'ера М.Гікалы пачалася ў 1921 г. Ён быў членам Сярэднеазіяцкага бюро ЦК УКП(б) (1927—1928), працаваў першым сакратаром ЦК КП(б) Узбекскай ССР (1929—1930), першым сакратаром ЦК КП(б) Азербайджанскай ССР, пасля — намеснікам загадчыка арганізацыйна-інструктарскага аддзела ЦК УКП(б) (1930—1931), з 1931 г.— сакратаром Маскоўскага абласнога і гарадскога камітэтаў УКП(б), загадчыкам арганізацыйнага аддзела Маскоўскага камітэта УКП(б).



У 1926—1927 гг. М.Гікала як партыйны функцыянер навучаўся на курсах марксізму-ленінізму пры Камуністычнай акадэміі [2, с. 53].

XIV з'езд Кампартыі Беларусі, які адбыўся 23—29 студзеня 1932 г., выбраў 117 членаў і 56 кандыдатаў у члены ЦК. Пленум ЦК КП(б)Б, выбраны гэтым з'ездам, зацвердзіў Бюро ЦК КП(б)Б на чале з М.Ф.Гікалам. Такім чынам, 29 студзеня 35-гадовы Мікалай Гікала змяніў свайго папярэдніка — равесніка К.Гея на пасадзе першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі.

## *Мікалай Гікала як палітычны дзеяч*

***Да пачатку кіраўніцтвам Кампартыі Беларусі М.Гікала меў адзінаццацігадовы вопыт кіраўнічай партыйнай работы. У студзені 1932 г. — студзені 1937 г. М.Ф.Гікала быў першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі і Мінскага гаркама партыі [1, с. 253]. Акрамя таго, ён з'яўляўся членам Прэзідыума ЦВК БССР, Рэўваенсавета Беларускай ваеннай акругі, членам Рэвізійнай камісі УКП(б) (1930—1934), кандыдатам у члены ЦК УКП(б) (1934—1937), членам Палітбюро ЦК Кампартыі Украіны (1937).***



Помнік змагарам за савецкую ўладу — Мікалаю Гікалу, Асланбеку Шэрыпаву і Гапуру Ахрыеву — у Грозным.

У гісторыі ідэолага-палітычнай барацьбы першай паловы 1930-х гг. значную ролю ў развіцці далейшых падзей адыграў аб'яднаны пленум ЦК і ЦК КП(б)Б, які праходзіў у Мінску 17—20 лютага 1933 г. На ім першы сакратар М.Ф.Гікала зазначыў: *"Перш за ўсё трэба па-бальшавіцку ўсвядоміць, што мы, гэта значыць пленум ЦК, ЦК, бюро ЦК, да гэтага часу не вялі барацьбу за прынцыпы пралетарскага інтэрнацыяналізму. [Мы] павінны ўсвядоміць, што ў шэрагу выпадкаў партыйныя і савецкія арганізацыі патуралі буржуазна-кулацкаму нацыяналізму, мы павінны ўсвядоміць, што дзякуючы своечасоваму ўмяшанню ЦК УКП(б) і той дапамозе, якую нам аказала [газета] "Праўда", мы сапраўды па-бальшавіцку мабілізаваліся на практычнае ажыццяўленне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі"*.

17 студзеня 1934 г. М.Гікала ў дакладзе на XV з'ездзе Кампартыі Беларусі, характарызуючы праўдзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР, падкрэсліў: *"Мы за мінулы перыяд пры помачы ЦК УКП(б), пры помачы "Праўды" правялі вялікую работу па ўскрыцці контррэвалюцыйнай работы нацыяналістычных элементаў, правялі вялікую барацьбу супраць нацыяналістычных ухілаў унутры партыі, з канкрэтнымі носьбітамі гэтых ухілаў...*

*Мы за гэты час грунтоўна разграмілі контррэвалюцыйную беларускую нацдэмаўшчыну, выявілі рад контррэвалюцыйных нацдэмаўскіх груповак...*

*Мы павінны ўзмацніць нашу барацьбу за бальшэвіцкае праўдзенне беларусізацыі..."* [4, с. 37—41].

Прызнаўшы палітычную лінію ЦК Кампартыі Беларусі правільнай, практычную лінію здавальняючай, XV з'езд разам з тым падкрэсліў, што за справаздачны перыяд Кампартыя БССР і яе кіраўніцтва — ЦК мелі шэраг буйных памылак у сваёй дзейнасці.

На сходзе актыву Мінскай гарадской партарганізацыі 23 жніўня 1936 г. М.Ф.Гікала прысвяціў свой даклад справе пільнасці і палітычнай слабасці партыйных арганізацый Беларусі. У ім былі такія радкі: *"Товарищи, из письма ЦК ВКП(б) в связи с уроками злодейского убийства товарища Кирова, партия оценила в своей работе серьёзный вывод, в первую очередь, вывод о необходимости настоящей, подлинно революционной большевистской бдительности по отношению к врагу.*

*Этот вывод сделала КП(б)Б и для себя...*

*Первая наиболее важная ошибка заключается в том, что мы не разоблачили известного контрреволюционного троцкиста Леншнера.*

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы